«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

За нанясенне трох надпісаў на прыпынках мужчыну асудзілі на 1,5 года "хатняй хіміі"

10.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Суд Драгічынскага раёна. Фота spring96.org

У судзе Драгічынскага раёна 10 лістапада вынеслі прысуд Яўгену Кожуху, якога вінавацілі ў апаганьванні збудаванняў і псаванні маёмасці (арт. 341 КК).

Справу разглядала суддзя **Юлія Кукса**, бок дзяржабвінавачвання прадстаўляў **Уладзіслаў Мешчанчук**.

Паводле абвінавачвання, увечары 16 жніўня 2021 года Яўген Кожух, маючы адзіны намер на апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці, знаходзячыся ў грамадскіх месцах, а менавіта на прыпынках грамадскага транспарту "Вулька", размешчаных насупраць дома 22 і 58 па вуліцы Савецкай у аграгарадку Вулька Драгічынскага раёна, і на прыпынку грамадскага транспарту "Сіманавічы", размешчаным каля дома 3 па вуліцы Савецкай у вёсцы Сіманавічы Драгічынскага раёна, наўмысна нанёс на сцены згаданых прыпынкаў фарбавальнікам чырвонага колеру

з аэразольнага балона цынічныя надпісы і малюнкі: "Жыве Беларусь", "Не забудем. Не простим", "3% уходи", чым апаганіў паказаныя збудаванні і здзейсніў іх псаванне. У выніку чаго абвінавачаны прычыніў шкоду КУП "Брэстаблбуд" на агульную суму 82 рублі 98 капеек.

Яўген Кожух віну прызнаў і добраахвотна ў дасудовым парадку пакрыў шкоду. Паводле яго слоў, ён, нагледзеўшыся відэа ў інтэрнэце і паддаўшыся ўплыву экстрэмісцкіх тэлеграм-каналаў, узяў балончык з фарбай, які набыў даўно, і пайшоў па вёсцы расфарбоўваць прыпынкі. На тое, каб абыйсці тры прыпынкі, у мужчыны сышло каля 1,5 гадзін. Пасля ён вярнуўся пешшу дадому, паставіў балончык у гаражы і пайшоў спаць.

> *"У летні перыяд працаваў у Оршы — пасвілі кароў, і мясцовы доктар даў балончык пазначаць хворых жывёлін. Малінавага колеру фарба ўнутры. Я трошкі дальтонік, блытаюся ў колерах. З тых часоў балончык і ляжаў. Думак схаваць яго не было",* — распавёў **Яўген Кожух**.

Мужчына нікому не казаў, куды ідзе, перасоўваўся пешшу, без мэты. Адзначыў у судзе, што ўсведамляў, напэўна, што псуе вонкавы выгляд, а калі б не ўсведамляў — нанёс бы надпісы ўдзень.

На пытанне, што Кожух хацеў выказаць гэтымі надпісамі, ён адказаў: *"Нічога. Глупства сваё"*.

На калодзежы ў двары дома абвінавачванага напісаная фраза "Жыве Белая Русь", якую з вуліцы не бачна. На пытанне, навошта нанесеная гэта фраза, адказаў, што хацеў паспрабаваць, як піша балончык.

Паколькі ў судзе Яўген Кожух не мог узгадаць, якія надпісы наносіў, былі агучаныя ягоныя паказанні: спачатку на адным прыпынку ён напісаў "Жыве Беларусь", на другім — "Не забудем. Не простим", а ў Сіманавічах — "3% уходи". Абвінавачванага затрымалі на працы супрацоўнікі ГУБАЗіК.

У працэсе быў дапытаны сведка — супрацоўнік Драгічынскага РУУС **Мікалай Пухір**. Раней ён працаваў участковым, ведаў абвінавачванага. У той дзень раніцай ехаў на машыне і ўбачыў надпіс "Жыве Беларусь" на прыпынку "Вулька", пра гэта ён паведаміў у РУУС. Пра нанесеныя на іншых прыпынках надпісы ён даведаўся ад супрацоўнікаў міліцыі.

З надпісаў былі ўзятыя ўзоры саскобаў фарбы, праведзена экспертыза, паводле вынікаў якой *"выявіць, ці з'яўляюцца дадзеныя рэчывы лакафарбавымі матэрыяламі, не ўяўляецца магчымым"*, а *"рэчывы баграна-чырвонага колеру не прыдатныя для правядзення даследавання"*.

Падчас спрэчак бакоў пракурор паказаў на тое, што з абвінавачвання варта выключыць кваліфікуючую прыкмету "апаганьванне збудаванняў цынічнымі надпісамі", прасіў суд прызнаць Яўгена Кожуха вінаватым і

прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў.

Абвінавачваны паўтарыў, што прызнае віну, адзначыў, што *"без пакарання нічога не праходзіць"*, але ён усвядоміў сваю памылку. У апошнім слове Яўген Кожух сказаў:

> *"Здзейсніў — значыць павінен адказаць. Назад дарогі няма. Ужо ўсё зроблена. Навука на ўсё астатняе жыццё будзе".*

У выніку суддзя Юлія Кукса пагадзілася з пазіцыяй дзяржабвінавачвання і асудзіла Яўгена Кожуха на **1,5 года "хатняй хіміі"**.

Опубликовать





За ўдзел у акцыі пратэсту ў Мінску асудзілі палітзняволеную Галіну Лагацкую (дапоўнена)

У Жлобіне за тыдзень – тры суды за ўдзел у акцыях пратэсту ў 2020 годзе

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 23 траўня па 14 чэрвеня

Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

ГАЛОЎНАЕ

Патрабуем адмяніць прысуд у дачыненні да Леаніда Судаленкі, спыніць дзяржаўнае самавольства і пераслед праваабаронцаў





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Пяць гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму і вялізны штраф: прысуд праваабаронцу Леаніду Судаленку

Затрыманне, спецвытворчасць, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 21 чэрвеня

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

Ліквідацыя грамадскіх арганізацый, новыя затрыманні: хроніка пераследу 20 чэрвеня (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Франаку Вячорку прызначылі 20 гадоў пазбаўлення волі

Магілёўскую керамістку асудзілі на 1,5 года калоніі за перасланае

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY